ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

ВЕСЦІ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК. 2024. Т. 69, № 1

ИЗВЕСТИЯ
НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК БЕЛАРУСИ

СЕРИЯ ГУМАНИТАРНЫХ НАУК. 2024. Т. 69, № 1

Журнал основан в январе 1956 г.
Выходит четыре раза в год
Учредитель – Национальная академия наук Беларуси
Журнал зарегистрирован в Министерстве информации Республики Беларусь,
свидетельство о регистрации № 394 от 18.05.2009

Журнал рецензируется. Входит в Перечень научных изданий Республики Беларусь для опубликования результатов диссертационных исследований, включен в базу данных Российского индекса научного цитирования (РИНЦ)

Главный редактор:

Александр Александрович Коваленя – Отделение гуманитарных наук и искусств Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

Редакционная коллегия:

В. И. Бельский – Заместитель Председателя Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь, Минск, Беларусь *(заместитель главного редактора)*
А. И. Локотко – Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь *(заместитель главного редактора)*
М. С. Макрицкая – Издательский дом «Беларуская навука», Минск, Беларусь *(ведущий редактор журнала)*

Е. М. Бабосов – Институт социологии Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь
П. А. Водопьянов – Белорусский государственный технологический университет, Минск, Беларусь
В. В. Гниломедов – Филиал «Институт литературоведения имени Янки Купалы» государственного научного учреждения «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси», Минск, Беларусь
В. Л. Гурский – Президиум Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь
А. Е. Гучок – Высшая аттестационная комиссия Республики Беларусь, Минск, Беларусь
В. В. Данилович – Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Минск, Беларусь
Т. И. Довнар – Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь
А. И. Жук – Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка, Минск, Беларусь
И. Л. Копылов – Филиал «Институт языкознания имени Якуба Коласа» государственного научного учреждения «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси», Минск, Беларусь

А. Д. Король – Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь
В. Л. Лакиза – Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь
Н. Л. Мысливец – Институт социологии Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь
М. В. Мясникович – Коллегия Евразийской экономической комиссии, Москва, Россия
П. Г. Никитенко – Институт экономики Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь
И. В. Саверченко – Филиал «Институт литературоведения имени Янки Купалы» государственного научного учреждения «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси», Минск, Беларусь
А. С. Шамрук – Филиал «Институт искусствоведения, этнографии и фольклора имени Кондрата Крапивы» государственного научного учреждения «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси», Минск, Беларусь
В. Н. Ярмолинская – Филиал «Институт искусствоведения, этнографии и фольклора имени Кондрата Крапивы» государственного научного учреждения «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси», Минск, Беларусь

Р е д а к ц и о н н ы й с о в е т:

А. Н. Булыко – Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь
В. И. Васильев – Центр истории и теории культуры и академического сектора науки Федерального государственного бюджетного учреждения науки «Научный и издательский центр «Наука» Российской академии наук», Москва, Россия
Г. Генчель – Институт славистики Университета Карла фон Осецкого, Ольденбург, Германия
С. Ю. Глазьев – Коллегия по интеграции и макроэкономике Евразийской экономической комиссии, Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Московский государственный университет имени М. В. Ломоносова», Москва, Россия
Е. К. Голаховска – Институт славистики Польской академии наук, Департамент лингвистики, Варшава, Польша
А. Е. Дайнеко – Белорусский республиканский фонд фундаментальных исследований, Минск, Беларусь
В. А. Ильин – Федеральное государственное бюджетное учреждение науки «Вологодский научный центр Российской академии наук», Вологда, Россия
С. Л. Кандыбович – Российская академия образования, Рязанский государственный университет имени С. А. Есенина, Федеральная национально-культурная автономия белорусов России, Совет при Президенте Российской Федерации, по межнациональным отношениям, Консультативный совет по делам белорусов зарубежья при МИД Республики Беларусь, Москва, Россия
С. П. Карпов – Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Московский государственный университет имени М. В. Ломоносова», Москва, Россия
Е. Миронович – Белостокский университет, Белосток, Польша
А. А. Сатыбалдин – Институт экономики Комитета науки Министерства образования и науки Республики Казахстан, Алматы, Казахстан
А. В. Смирнов – Федеральное государственное бюджетное учреждение науки «Институт философии Российской академии наук», Москва, Россия
Чжан Юйянь – Институт мировой экономики и политики Китайской академии общественных наук, Пекин, Китай
Янг Хионг – Институт социологии Шанхайской академии социальных наук, Шанхай, Китай

Адрес редакции:
ул. Академическая, 1, к. 119, 220072, г. Минск, Республика Беларусь.
Тел.: + 375 17 272-19-19; e-mail: humanvesti@mail.ru
Сайт: vestihum.belnauka.by

ИЗВЕСТИЯ НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК БЕЛАРУСИ.
Серия гуманитарных наук. 2024. Т. 69, № 1.
Выходит на русском, белорусском и английском языках

Редактор *М. С. Макрицкая*
Компьютерная вёрстка *Н. И. Кашуба*

Подписано в печать 08.01.2024. Выход в свет 29.01.2024. Формат 60×84 $^{1}/_{8}$. Бумага офсетная.
Печать цифровая. Усл. печ. л. 10,23. Уч.-изд. л. 11,3. Тираж 74 экз. Заказ 6.
Цена номера: индивидуальная подписка – 13,34 руб., ведомственная подписка – 31,28 руб.

Издатель и полиграфическое исполнение:
Республиканское унитарное предприятие «Издательский дом «Беларуская навука».
Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/18 от 02.08.2013. ЛП № 02330/455 от 30.12.2013. Ул. Ф. Скорины, 40, 220084, г. Минск, Республика Беларусь

© РУП «Издательский дом «Беларуская навука».
Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук, 2024

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

PROCEEDINGS
OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

HUMANITARIAN SERIES, 2024, vol. 69, no. 1

This journal was founded in 1956

Frequency 4 issues per annum

Founded by the National Academy of Sciences of Belarus

This journal is registered by the Ministry of Information of the Republic of Belarus,
Certificate of Registration no. 394 dd. 18 May 2009

The journal is included in The List of Journals for Publication of the Results of Dissertation Research in the Republic of Belarus and in the database of the Russian Scientific Citation Index (RSCI)

Editor-in-Chief:

Aleksandr Aleksandrovich Kovalenya – Department of Humanities and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

Editorial Board:

Valery I. Belski – Deputy Chairman of the Council of the Republic of the National Assembly of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus *(Associate Editor-in-Chief)*
Aleksandr I. Lokotko – Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus *(Associate Editor-in-Chief)*
Marina S. Makritskaya – Belaruskaya Navuka Publishing House *(Lead Editor)*

Evgeny M. Babosov – Institute of Sociology of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
Pavel A. Vodopyanov – Belarusian State Technological University, Minsk, Belarus
Vladimir V. Gnilomedov – Branch "Institute of Literary Studies named after Yanka Kupala" of the State Scientific Institution "Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Belarus
Vasily L. Gurski – Presidium of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
Aleksandr E. Guchok – Higher Attestation Commission of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus
Vyacheslav V. Danilovich – Academy of Public Administration under the President of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus
Taisiya I. Dovnar – Belarusian State University, Minsk, Belarus
Aleksandr I. Zhuk – Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus
Igor L. Kopylov – Branch "Institute of Linguistics named after Yakub Kolas" of the State Scientific Institution "Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Belarus
Andrei D. Korol' – Belarusian State University, Minsk, Belarus
Vadim L. Lakiza – Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
Nikolai L. Myslivets – Institute of Sociology of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
Mikhail V. Myasnikovich – Board of the Eurasian Economic Commission, Moscow, Russia
Petr G. Nikitenko – Institute of Economics of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
Ivan V. Saverchenko – Branch "Institute of Literary Studies named after Yanka Kupala" of the State Scientific Institution "Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Belarus

Alla S. Shamruk – Branch "Institute of Art History, Ethnography and Folklore named after Kondrat Krapiva" of the State Scientific Institution "Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Belarus
Veronika N. Yarmolinskaya – Branch "Institute of Art History, Ethnography and Folklore named after Kondrat Krapiva" of the State Scientific Institution "Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Belarus

E d i t o r i a l C o u n c i l:

Aleksandr N. Bulyko – Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
Vladimir I. Vasilyev – Center for the History and Theory of Culture and the Academic Sector of Science of the Federal State Budgetary Institution of Science «Science and Publishing Center "Nauka" of the Russian Academy of Sciences», Moscow, Russia
Gerd Hentsthel – Institute of Slavic Studies at the Karl von Ossietzky University, Oldenburg, Germany
Sergey Yu. Glazyev – Board for Integration and Macroeconomics of the Eurasian Economic Commission, Department of the Faculty of Public Administration of the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education "Lomonosov Moscow State University", Moscow, Russia
Eva K. Golakhovska – Institute of Slavic Studies of the Polish Academy of Sciences, Department of Linguistics, Warsaw, Poland
Aleksey Ye. Daineko – Belarusian Republican Foundation for Fundamental Research, Minsk, Belarus
Vladimir A. Il'in – Federal State Budgetary Institution of Science "Vologda Scientific Center of the Russian Academy of Sciences", Moscow, Russia
Sergey L. Kandybovich – Russian Academy of Education, Ryazan State University named after S. A. Yesenin, Federal National-Cultural Autonomy of Belarusians of Russia, Council under the President of the Russian Federation for Interethnic Relations, Advisory Council on the Affairs of Belarusians Abroad under the Ministry of Foreign Affairs of the Republic of Belarus, Moscow, Russia
Sergey P. Karpov – Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education "Lomonosov Moscow State University", Moscow, Russia
Evgeni Mironovich – University of Bialystok, Bialystok, Poland
Azimkhan A. Satybaldin – Institute of Economics of the Science Committee of the Ministry of Education and Science of the Republic of Kazakhstan, Almaty, Kazakhstan
Andrei V. Smirnov – Federal State Budgetary Institution of Science of the Institute of Philosophy of the Russian Academy of Sciences, Moscow, Russia
Zhan Yuyan – Institute of World Economy and Politics of the Chinese Academy of Social Sciences, Beijing, China
Yang Xiong – Institute of Sociology of the Shanghai Academy of Social Sciences, Shanghai, China

Address of the Editorial Office:
1 Akademicheskaya Str., Room 119, 220072, Minsk, Republic of Belarus.
Tel.: + 375 17 272-19-19; e-mail: humanvesti@mail.ru
Website: vestihum.belnauka.by

PROCEEDINGS OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS.
Humanitarian Series, 2024, vol. 69, no. 1.
Printed in Russian, Belarusian and English

Editor *M. S. Makritskaya*
Computer imposition *N. I. Kashuba*

Signed to print on 08.01.2024. Published on 29.01.2024. Format 60×84 1/8. Offset paper.
Digital printing. Printed sheets 10,23. Publisher's sheets 11,3. Circulation 74 copies. Order 6.
Number price: individual subscription – BYN 13.34, departmental subscription – BYN 31.28.

Publisher and printing execution:
Republican unitary enterprise "Publishing House "Belaruskaya Navuka".
Certificate on the state registration of the publisher, manufacturer,
distributor of printing editions No. 1/18 dated August 2, 2013. License for the press no. 02330/455 dated December 30, 2013.
Address: F. Scorina Str., 40, 220084, Minsk, Republic of Belarus.

© RUE "Publishing House "Belaruskaya Navuka",
Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series, 2024

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

ЗМЕСТ

ДА 95-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

Каваленя А. А. Акадэмічная гуманітарыстыка – выклік XXI стагоддзя 7

ФІЛАСОФІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ

Головач А. А. “Расчеловечивание человека” – ключевая проблема современной эпохи 18

ГІСТОРЫЯ

Пілецкі В. А. Пра адрозненне антычнай і сярэднявечнай адукаванасці 25

МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР

Ремишевский К. И. “Старажытны беларускі народны тэатр” – кинохроника научного факта 36

Ничипорович А. О. Эволюция подходов к соединению “старого” и “нового” в исторической городской среде 45

ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Бразгуноў А. У. Пейзаж і ландшафт у беларускім пісьменстве XVII ст. 53

ПРАВА

Трипузова А. А. Научно-правовое обеспечение формирования и развития конституционной экономики в Республике Беларусь 60

ЭКАНОМІКА

Авсюк А. А. Сопряжение китайской инициативы зеленый «Пояс и путь» и экологической повестки ЕАЭС с участием Республики Беларусь 74

ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ

Памяти Сергея Александровича Шавеля 87

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

CONTENTS

TO THE 95TH ANNIVERSARY OF FOUNDING OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

Kavalenia A. A. Academic humanitarian science – the challenge of the XXI century 7

PHILOSOPHY AND SOCIOLOGY

Golovach A. A. "Dehumanization of man" is a key problem of the modern era 18

HISTORY

Piletsky V. A. About the distinction ancient and medieval education..... 25

ART HISTORY, ETHNOGRAPHY, FOLKLORE

Ramisheuski K. I. "The Old Belarusian People's Theatre". A newsreel of a scientific fact 36

Nichiporovich A. O. Evolution of approaches to the connection of the "old" and the "new" in the historical urban environment..... 45

LITERARY SCIENCE

Brazgunou A. U. Paysage and Landscape in Belarusian Writings of the 17th century..... 53

LAW

Trypuzava A. A. Scientific and legal support for the formation and development of the constitutional economy in the Republic of Belarus 60

ECONOMICS

Avsyuk A. A. Connection of the Chinese Green Belt and Road Initiative and the EAEU environmental agenda with the participation of the Republic of Belarus..... 74

SCIENTISTS OF BELARUS

In memory of Sergei Alexandrovich Shavel 87

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

ДА 95-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

TO THE 95TH ANNIVERSARY OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

УДК 001.32:[1/3+7/9](476)«20»
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2024-69-1-7-17

Паступіў у рэдакцыю 07.12.2023
Received 07.12.2023

А. А. Каваленя

Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

АКАДЭМІЧНАЯ ГУМАНІТАРЫСТЫКА – ВЫКЛІК XXI СТАГОДДЗЯ

Аннотация. Показана история развития белорусской гуманитарной науки с древних времен до наших дней. Особое внимание уделено достижениям Отделения гуманитарных наук и искусств Национальной академии наук Беларуси в начале XXI столетия.

Ключевые слова: история, гуманитарная наука, лингвистика, литературоведение, философия

Для цитирования: Каваленя, А. А. Акадэмічная гуманітарыстыка – выклік XXI стагоддзя / А. А. Каваленя // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2024. – Т. 69, № 1. – С. 7–17. https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2024-69-1-7-17

Aliaksandr A. Kavalenia

Department of Humanitarian Sciences and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

ACADEMIC HUMANITARIAN SCIENCE – THE CHALLENGE OF THE XXI CENTURY

Abstract. The article shows the history of the development of Belarusian humanitarian science from ancient times to the present day. Particular attention is paid to the achievements of the Department of Humanitarian Sciences and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus at the beginning of the 21st century.

Keywords: history, humanities, linguistics, literary criticism, philosophy

For citation: Kavalenia A. A. Academic humanitarian science – the challenge of the XXI century. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2024, vol. 69, no. 1, pp. 7–17 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-1-7-17

Уводзіны. Гістарычны вопыт пераканаўча сведчыць, што галоўнай рухаючай сілай развіцця грамадства з'яўляецца чалавек, узброены навукова-тэхнічнымі дасягненнямі. Агульнавядома, што ніякія матэрыяльныя структуры, палітычныя інстытуты і навуковыя ідэі без дзейнасці людзей, самі па сабе, не маюць грамадскай вартасці. Навуковыя веды ўсё больш актыўна ўваходзяць у штодзённы побыт людзей. Сёння мы нават не звяртаем увагі на той факт, што большасць жыхароў з'яўляюцца спажыўцамі і карыстальнікамі сучасных складаных тэхнічных прылад, якія сталі практычным вынікам развіцця навукі.


Пад уплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу адбываюцца істотныя змены не толькі ў паўсядзённым жыцці людзей, але і ў развіцці сацыяльнай структуры грамадства. Толькі дзякуючы ўдумліваму выкарыстанню назапашанага вопыту і інтэлектуальнаму развіццю чалавека ажыццяўляюцца пастаянныя навуковыя адкрыцці, якія, з аднаго боку, уплываюць на агульны працэс развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, а з другога – на сацыяльную эвалюцыю чалавека і структурныя пераўтварэнні грамадскага ладу жыцця. Не паглыбляючыся ва ўсе дэталі развіц-

© Каваленя А. А., 2024

ця грамадства, назавём важнейшыя этапы грамадскіх пераўтварэнняў. Вядома, што першая хваля звязана з «аграрнай рэвалюцыяй», у выніку якой на змену грамадству паляўнічых і збіральнікаў прыйшло грамадства земляробаў і жывёлаводаў, адбыўся пераход ад прысвойвальнай гаспадаркі да вытворчай. Другі этап сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў быў абумоўлены прамысловай рэвалюцыяй, пераходам ад ручной працы да машыннай вытворчасці, які прывёў да фарміравання індустрыяльнага грамадства. І, нарэшце, у выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі адбылося станаўленне постіндустрыяльнага грамадства.

Сучасныя ўяўленні пра грамадства і грамадскі лад жыцця з'яўляюцца вынікам шматвяковай гісторыі грамадскай думкі і навуковага пазнання. Вопыт сведчыць, што на працягу многіх стагоддзяў адбываліся станаўленне і развіццё ідэй, поглядаў і вучэнняў, у якіх асвятляўся складаны працэс грамадскага жыцця. Гуманітарныя веды як навука, што вывучае дзейнасць чалавека, узніклі ў Старажытнай Грэцыі. Успомнім першую акадэмію, заснаваную Платонам яшчэ ў 380-х гг. да н. э. каля Афін, як правобраз пазнейшых акадэмій навук і ўніверсітэтаў. Вядома, што ўжо ў той перыяд, у працэсе назапашвання і сістэматызацыі ведаў, якія называліся «мудрасцю», пачалі ўзнікаць першыя філасофскія вучэнні, накіраваныя на дасягненне маральнай і інтэлектуальнай дасканаласці чалавека і грамадства.

Асноўная частка. Неабходна адзначыць той факт, што і беларуская зямля заўсёды была багатая на таленты і самародкі, якія сваёй дзейнасцю пакінулі адметны след у развіцці грамадскага ладу і навуковага прагрэсу не толькі на радзіме, але і ў Еўропе. Ля вытокаў навуковай думкі былі многія прадстаўнікі беларускага народа. На жаль, гісторыя не захавала ўсе імёны. Назавём толькі некаторых асветнікаў: Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі, Мікалай Гусоўскі і Францыск Скарына, Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец, Мялецій Сматрыцкі і Спірыдон Собаль, Сімяон Полацкі і Казімір Лышчынскі, Ян Баршчэўскі і Ян Чачот, Ігнат Дамейка і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Уладзіслаў Сыракомля і Вінцэсь Каратынскі і многія іншыя. Яны з'яўляюцца гонарам беларускага народа. Іх апантаная дзейнасць – яскравае сведчанне багацця інтэлектуальнага рэсурсу нашых продкаў.



Мал. 1. Тытульны ліст "Песні пра зубра" М. Гусоўскага
Fig. 1. Title page of "Song of the Bison" by M. Husoŭski

Бясспрэчны гонар нашага народа – падрыхтоўка і выданне выхадцамі з беларускай зямлі статутаў Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Напрыклад, Статут 1588 г. быў распрацаваны пры ўдзеле канцлера Яўстафія Валовіча і падканцлера ВКЛ Льва Сапегі і выдадзены ў друкарні, заснаванай у Вільні Пятром Мсціслаўцам на грошы магілёўскіх купцоў Мамонічаў.

Не могуць не здзіўляць сваёй навуковай дзёрзкасцю думкі многіх нашых суайчыннікаў, якія служылі не толькі справе асветніцтва, але і ўзбагачэнню навукі. Напрыклад, паэт-гуманіст эпохі Адраджэння Мікалай Гусоўскі выказаў даволі прагрэсіўную для таго часу думку пра важнасць «прыроды ў фарміраванні маральных каштоўнасцей чалавека». У сваім лепшым творы «Песня пра зубра» (мал. 1) ён раскрывае побыт, сацыяльна-палітычныя ўмовы жыцця і самабытнасць народа, кажучы пра важнасць прыроды для ўсебаковага развіцця асобы.

Асветнікі лічылі, што вывучэнне роднай прыроды з'яўляецца першаасновай фарміравання любові да Радзімы. Так, Францыск Ска-

рына 6 жніўня 1517 г. выдаў у Празе сваю першую кнігу «Псалтыр» (мал. 2), якая была выкладзена зразумелай для простага люду мовай. За гады жыцця ў Празе Скарына здолеў надрукаваць 23 кнігі Бібліі, якія аздоблены гравюрамі, адрозніваюцца высокай тэхнікай выканання і прыгажосцю. Ужо пасля вяртання на радзіму ён заснаваў у Вільні першую ў Беларусі друкарню, дзе выдаў «Малую падарожную кніжку» і «Апостала». Дзякуючы яго дзейнасці беларусы першыя сярод усходнееўрапейскіх народаў атрымалі друкаваную кнігу на роднай мове. Заслуга Францыска Скарыны заключаецца таксама ў тым, што на беларускіх землях зарадзіліся такія галіны навукі, як батаніка і медыцына.


БИВЛИѦ РУСКЯ
ВЫЛОЖЕНЯ ДОКТОРЪМЪ
ФРАНЦИСКОМЪ СКОРИНОЮ
ИЗЪ СЛАВНАГО ГРАДА ПО
ЛОЦЬКЯ, БОГУ КОЯТИ Й
ЛЮДЕМЪ ПОСПОЛИТЫМЪ
КЪ ОБРѢМЪ НАУЧЕНИЮ:

Мал. 2. Тытульны ліст выдання Ф. Скарыны
Fig. 2. Title page of the edition by F. Skaryna

Прадаўжальнікам ідэй Скарыны і Гусоўскага можна лічыць Сымона Буднага (каля 1530–1593 гг.), дзеяча беларускай культуры, таленавітага вучонага, перакладчыка, педагога, аднаго з кіраўнікоў рэфарматарскага руху на беларускіх землях. Ён адыграў значную ролю ў развіцці навукі і асветніцтва, яго называлі адным з самых папулярных распаўсюджвальнікаў прагрэсіўных ідэй.

Вядома, што на працягу 240 гадоў (1580–1830 гг.) адукацыя на тэрыторыі Беларусі знаходзілася пад уплывам езуітаў. Выкладанне прыродазнаўства дзецям цалкам ігнаравалася. Аднак многія беларускія асветнікі лічылі, што веды пра прыроду неабходныя. Нагадаем, яшчэ ў прадмове да кнігі Юдзіф, якая была выдадзена 9 лютага 1519 г., Ф. Скарына піша пра тое, што неабходна любіць сваю краіну і свой народ, «паколькі ад прыроды звяры, якія ходзяць па пустыні, знаюць ямы свае, птушкі, якія лятаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае, рыбы, якія плаваюць у моры і ў рэках, адчуваюць віры свае, пчолы і падобныя ім абараняюць вуллі свае, – то таксама і людзі, дзе яны нарадзіліся і былі выхаваны ў законе Божым, да таго месца маюць вялікую пяшчоту» [1, с. 73].

Дзякуючы дзейнасці Мялеція Сматрыцкага (каля 1577–1633 гг.) была падрыхтавана і выдадзена «Граматыка», якая стала даступным падручнікам па славянскім мовазнаўстве. Значны след у гісторыі пакінуў выдатны беларускі мысліцель Казімір Лышчынскі (1634–1689 гг.). У сваім маёнтку ён адкрыў школу, у якой вучыліся не толькі хлопчыкі, але і дзяўчынкі, дзеці мясцовай шляхты і сялян. Яго ідэі былі выкладзены ў трактаце «Аб неіснаванні Бога». Як бачна, у розныя перыяды гістарычнага развіцця асветнікі імкнуліся не толькі зберагчы родную мову і культуру, але і выступалі за развіццё на беларускіх землях адукацыі і навуковых ведаў, каб данесці іх да народа [2].

Навуковыя веды арганічна ўваходзілі ў матэрыяльнае і духоўнае жыццё беларускага грамадства, адыгрывалі, па сутнасці, вызначальную ролю ў далейшым развіцці творчага інтэлекту нацыі. Дасягненні многіх нашых суайчыннікаў, іх творчыя працы і дзейнасць аб'ектыўна ўплывалі на пашырэнне адукацыйнай і навуковай прасторы на беларускай зямлі, фарміраванне сістэмы вышэйшай адукацыі. Іх дзейнасць з'явілася падмуркам для станаўлення і развіцця беларускай навукі, адкрыцця навучальных устаноў.

У пачатку XX ст. у Беларусі існавалі тры навукова-даследчыя ўстановы: Беняконская сельскагаспадарчая доследная станцыя, Станцыя лекавых раслін пад Магілёвам і Мінская балотная станцыя. Навукова-даследчай працай у Беларусі ў 1913 г. займаліся звыш 80 вучоных.

Значная падзея ў навуковым жыцці Беларусі – стварэнне ў лютым 1921 г. Навукова-тэрміналагічнай камісіі, якая працавала спачатку пры Народным камісарыяце асветы і ажыццяўляла вялікую працу па ўпарадкаванні беларускай навуковай тэрміналогіі. У выніку з'явіліся кароткія слоўнікі тэрмінаў па граматыцы, логіцы, арыфметыцы, алгебры, батаніцы, геаметрыі, аналітычнай геаметрыі і трыганаметрыі.

На базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі ў пачатку 1922 г. быў створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Першапачаткова Інбелкульт асноўную ўвагу надаваў вывучэнню гуманітарных праблем, асабліва даследаванням беларускай мовы і літаратуры, нацыянальнай гісторыі і этнаграфіі. У 1924 г. у Інбелкульце былі створаны наступныя секцыі: гісторыка-археалагічная, беларускай мовы і літаратуры (з камісіяй па рэформе правапісу), беларускага мастацтва (з падсекцыямі: музейнай, тэатральнай і выяўленчага мастацтва), вывучэння рэвалюцыйнага руху (з камісіяй па стварэнні біяграфічнага слоўніка рэвалюцыянераў), этнаграфічная, прававая (з тэрміналагічнай камісіяй). Іх інтэнсіўная праца станоўча паўплывала на развіццё гуманітарнай навукі ў рэспубліцы. Так, з 1924 па 1928 г. у Беларусі было апублікавана 875 кніг на беларускай мове (для параўнання: у 1917–1920 гг. – толькі 42 кнігі). Да 1927 г. беларускай мовай валодалі 80 % служачых рэспубліканскіх органаў і 70 % служачых акруговых і раённых устаноў.

Далейшае развіццё нацыянальнай гуманітарыстыкі больш шырока разгарнулася пасля заснавання ў 1929 г. Беларускай акадэміі навук. Гэта быў знакавы этап далейшага ўмацавання айчыннай сацыяльна-гуманітарнай навукі, пашырэння ведаў у беларускім грамадстве. Нездарма на пачатку дзейнасці Беларускай акадэміі навук пераважную большасць яе членаў складалі вучоныя-гуманітарыі. Нават першымі яе прэзідэнтамі былі акадэмікі-гуманітарыі – У. М. Ігнатоўскі, П. В. Горын (Каляда), буйны дзяржаўны дзеяч І. З. Сурта. У першыя гады дзейнасці акадэміі перавага аддавалася гуманітарным даследаванням, прычым першыя два гады захоўвалася структура Інстытута беларускай культуры.

Прэзідыум Акадэміі навук БССР, разумеючы сацыяльную і грамадскую значнасць гуманітарных ведаў, 31 мая 1936 г. прыняў рашэнне аб стварэнні Аддзялення грамадскіх навук. У склад Аддзялення былі ўключаны Інстытут філасофіі і права, Інстытут эканомікі, Інстытут гісторыі, Інстытут літаратуры і мовы, Педкабінет і Фальклорная камісія. У 1992 г. яно было пераўтворана ў Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі. У розныя гады Аддзяленне ўзначальвалі С. Я. Вальфсон, У. М. Перцаў, Ц. С. Гарбуноў, П. Ф. Глебка, К. П. Буслаў, М. В. Бірыла, Г. М. Лыч, А. І. Падлужны, П. Г. Нікіценка. З 2009 г. Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў узначальвае акадэмік А. А. Каваленя.

Сёння ва ўстановах Аддзялення працуюць 869 чалавек, у тым ліку 582 даследчыкі, 50 дактароў і 197 кандыдатаў навук. Гонарам Аддзялення з'яўляецца творчая дзейнасць 9 акадэмікаў і 11 членаў-карэспандэнтаў.

У гістарычным лёсе Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў былі розныя этапы творчага развіцця. Неабходна звярнуць увагу на тую акалічнасць, што ў XXI ст., дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы і назапашанаму вопыту папярэднікаў, мы назіраем не проста значны прырост даследаванняў гуманітарыяў, але, можна сказаць, у пэўным сэнсе рэнесанс гуманітарных ведаў у Рэспубліцы Беларусь. Асаблівасцю навуковых даследаванняў вучоных-гуманітарыяў нашай краіны з'яўляецца тое, што пачынаючы з 2011 г. навуковыя даследаванні аб'яднаны ў адзінай дзяржаўнай праграме. Так, на 2021–2025 гг. заяўлены і зацверджаны заданні ў Дзяржаўную праграму навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы». Праграма ўключае наступныя восем падпраграм: «Гісторыя», «Філасофія», «Эканоміка», «Сацыялогія», «Права», «Культура і мастацтва», «Беларуская мова і літаратура», «Адукацыя», якія аб'ядноўваюць 54 заданні, што складаюць навуковы змест даследаванняў.

Кожную падпраграму ўзначальвае найбольш дасведчаны высокакваліфікаваны вучоны па профілі навуковага даследавання, які ажыццяўляе каардынацыю выканання заданняў. Галаўной арганізацыяй праграмы з'яўляецца Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Сёння ў рэалізацыі праграмы задзейнічана 2016 даследчыкаў з 46 навуковых арганізацый НАН Беларусі і вышэйшых навучальных устаноў. Сярод выканаўцаў праграмы – 8 акадэмікаў, 9 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі, 220 дактароў навук і 858 кандыдатаў навук. Навуковае кіраўніцтва праграмай ажыц-

цяўляе савет, у які ўваходзяць кіраўнікі падпраграм. Такая арганізацыйная форма навуковых даследаванняў у нашай краіне дазваляе аптымальна каардынаваць творчыя намаганні вучоных-гуманітарыяў, умацоўваць супрацоўніцтва і атрымліваць значныя якасныя і колькасныя вынікі.

Так, у 2022 г. вучоныя Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў апублікавалі амаль 2100 навуковых прац, у тым ліку – 134 кніжныя выданні (з іх 44 манаграфіі, 29 зборнікаў), 9 даведнікаў і энцыклапедый, 2 падручнікі. Было падрыхтавана і апублікавана звыш 1500 навуковых артыкулаў і дакладаў, больш за 430 тэзісаў дакладаў. Акрамя таго, з мэтай папулярызацыі навуковых ведаў, абмену творчым вопытам паміж айчыннымі і замежнымі вучонымі, апрабацыі новых ідэй у 2022 г. праведзена больш за 70 навуковых канферэнцый і пасяджэнняў круглых сталоў [3, с. 4].

За гады дзейнасці Аддзялення вучоныя-гуманітарыі падрыхтавалі сотні фундаментальных выданняў, якія з'яўляюцца важнейшым духоўна-культурным падмуркам беларускай нацыі і ўмацавання нацыянальнай дзяржаўнасці. Сёння вучоныя-гуманітарыі працягваюць закладзеныя ў XX ст. традыцыі. Звернем увагу на найбольш значныя дасягненні вучоных Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, якія атрымалі высокую ацэнку з боку навуковай супольнасці і шырокі рэзананс у беларускім грамадстве.

У гэтым шэрагу неабходна назваць «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» ў 37 выпусках [4] – фундаментальнае даследаванне, якое праводзілася ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа з 1960 па 2022 г. (мал. 3). Распрацоўка канцэпцыі гэтага ўнікальнага выдання ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі, дактароў філалагічных навук А. І. Жураўскага і А. М. Булыкі. На працягу шасці дзесяцігоддзяў вучоныя-філолагі ажыццяўлялі маштабную навукова-даследчую працу. Былі вывучаны рукапісныя і друкаваныя помнікі XIV–XVIII стст. самых розных жанраў, якія дазволілі выявіць асаблівасці лексікі старажытнага перыяду і велізарную колькасць варыянтаў графічнага адлюстравання слоў.

У выніку мэтанакіраванай і напружанай працы многіх пакаленняў беларускіх лінгвістаў быў створаны першы і адзіны ў свеце гісторыка-лінгвістычны даведнік, які максімальна поўна адлюстроўвае лексічны склад беларускай мовы XIV–XVIII стст. Дзякуючы таленту і нястомнай працы высокакваліфікаваных лінгвістаў у фундаментальнай працы ажыццёўлена лексікаграфічная апрацоўка больш за 75 тысяч слоў, зафіксаваных у граматах, дагаворах, уставах, летапісах, хроніках, храналогіях, раманах і аповесцях, мемуарных, публіцыстычных, навуковых і рэлігійных творах. Гэта праца з'яўляецца надзейнай крыніцай ведаў не толькі пра станаўленне беларускай мовы, але і пра мінулае беларускага народа, фарміраванне беларускай нацыі і гісторыі беларускай дзяржаўнасці, адкрывае шырокія магчымасці для вывучэння арфаграфіі, марфалогіі і сінтаксісу беларускай мовы. Напрыклад, пацверджана, што старабеларуская мова ў перыяд існавання Вялікага Княства Літоўскага выконвала ролю дзяржаўнай мовы і выступала мовай беларускай народнасці. Прычым яна выкарыстоўвалася ў справаводстве, судовай вытворчасці, пры складанні дыпламатычных дакументаў, зводаў законаў, у прыватнасці Статута Вялікага Княства Літоўскага, пры напісанні летапісаў і рэлігійных твораў. У выданні змяшчаюцца багатыя і разнастайныя звесткі пра развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры, арганізацыю сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця беларускага народа на працягу пяці стагоддзяў. Шматтомнае даследаванне пацвярджае непарыўную сувязь беларускіх вучоных-лінгвістаў з папярэднімі даследаваннямі І. Насовіча, Е. Раманава, Я. Карскага.



Мал. 3. «Гістарычны слоўнік беларускай мовы»

Fig. 3. «The Historical Dictionary of the Belarusian language»

Нельга не адзначыць і таго факта, што ў працэсе напружанай навукова-даследчай



Мал. 4. «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя»
Fig. 4. «History of Belarusian literature of the 20th century»

працы была створана ўнікальная рукапісная картатэка старажытнабеларускай лексікі. Яна налічвае больш за 1 060 000 картак, у якіх сабраны багаты фактычны матэрыял, і з'яўляецца гісторыка-культурнай спадчынай не толькі Беларусі, але і ўсяго славянскага свету.

Безумоўна, знакавай падзеяй у жыцці беларускага грамадства з'явіліся падрыхтоўка і выданне фундаментальнай працы «Беларусы» [5]. Этналагічнае даследаванне ў 13 тамах – гэта вынік шматгадовых палявых этнаграфічных экспедыцый, ажыццёўленых вучонымі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы за XX ст. Сабраныя ў выданні дакументальныя матэрыялы раскрываюць шматвяковае багацце традыцый беларускага народа, паказваюць асаблівасці этнічнага складу, дойлідства, дэмаграфічных, канфесійных, моўных і сацыяльных працэсаў, этнічнай самасвядомасці гарадскога і вясковага насельніцтва Беларусі.

Вялікую цікавасць выклікала чатырохтомнае выданне «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» [6] (мал. 4). Працу падрыхтавалі вучоныя Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. У кожнай кнізе прадстаўлены раздзелы паэзіі, прозы, драматургіі, крытыкі і літаратуразнаўства. Персанальныя артыкулы паказваюць індывідуальна-аўтарскія асаблівасці творчасці пісьменнікаў, а таксама нацыянальную спецыфіку беларускай літаратуры ў цэлым. Аўтары імкнуліся паказаць ролю і значэнне літаратуры ў паглыбленні грамадскай свядомасці, выхаванні ў новых пакаленняў патрыятызму і гуманізму, раскрыць патэнцыял беларускага мастацкага слова, яго непаўторнасць і ідэйна-эстэтычнае багацце.

Гонарам айчынных гуманітарыяў з'яўляецца падрыхтоўка вучонымі Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў 20 кніг арыгінальнай шматтомнай навуковай энцыклапедычнай працы «Гарады і вёскі Беларусі» [7] (мал. 5). На аснове велізарнага пласта архіўных і апублікаваных крыніц у шматтомніку ўпершыню ў айчыннай навуцы сабраны і абагульнены важнейшыя звесткі, якія адлюстроўваюць гісторыю, сучасны эканамічны і культурны стан усіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Беларусі – 6 абласцей, 118 раёнаў, а таксама гарадоў, пасёлкаў гарадскога тыпу, аграгарадкоў, вёсак і хутароў краіны з часу іх заснавання і да нашых дзён, у тым ліку і тых населеных пунктаў, якія ўжо перасталі існаваць. Навукова-даследчая праца над праектам працягвалася больш за 20 гадоў. У аснову выдання пакладзены шматлікія матэрыялы, выяўленыя ў гістарычных архівах і навуковых бібліятэках Мінска, Гродна, Масквы, Санкт-Пецярбурга,



Мал. 5. «Гарады і вёскі Беларусі»
Fig. 5. «Towns and Villages of Belarus»



Мал. 6. «Вялікі гістарычны атлас Беларусі»
Fig. 6. «The Great Historical Atlas of Belarus»

Вільнюса, абласных і занальных архівах краіны, звесткі з рэспубліканскіх і мясцовых музеяў. Кіраўніком аўтарскага калектыву і навуковым рэдактарам выдання з 2004 г. з'яўляецца акадэмік, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі А. І. Лакотка.

Значнай падзеяй у навуковым і грамадска-палітычным жыцці нашай краіны стала выданне «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» ў 4 тамах [8] – арыгінальнага і найбольш поўнага навукова-даведачнага картаграфічнага выдання, у якім сабрана больш за 400 унікальных карт (мал. 6). Праца па падрыхтоўцы атласа працягвалася больш за дзесяць гадоў. Дзякуючы прафесіяналізму калектыву стваральнікаў, а гэта беларускія вучоныя-гісторыкі, лінгвісты і картографы, быў створаны сапраўдны нацыянальны шэдэўр. Кожная старонка атласа заснавана на першакрыніцах, у тым ліку буйнамаштабных картах асобных тэрыторый, планах гарадоў, схемах знакавых бітваў. Кожны том атласа дапоўнены агульнымі картамі, на якіх паказаны ўсе населеныя пункты адпаведнага часу і пазначана іх прыналежнасць. Значэнне праекта для навуковага і культурнага жыцця Беларусі складана пераацаніць. У выданні картаграфічнымі сродкамі пераканаўча паказаны працэс фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Несумненна, акрамя асноўных сімвалаў (герба, сцяга і гімна) гэта шматтомная праца з'яўляецца візітнай карткай краіны. Невыпадкова, у 2018 г. «Вялікі гістарычны атлас Беларусі» атрымаў вышэйшую ўзнагароду ў намінацыі «Трыумф», а ў 2020 г. – прэмію «За духоўнае адраджэнне». Неабходна адзначыць той факт, што праблемы развіцця мовы, літаратуры і культуры знаходзяцца ў цэнтры ўвагі акадэмічных даследчыкаў.



Мал. 7. «Русско-белорусский системный семантический словарь»
Fig. 7. «Russian-Belarusian Semantic Dictionary»

Акрамя названых фундаментальных прац у апошнія гады падрыхтаваны «Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы» [9], «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» [10], «Русско-белорусский системный семантический словарь» [11] (мал. 7). Падрыхтаваны і выдадзены зборы твораў класікаў беларускай літаратуры: Якуба Коласа, Івана Шамякіна, Івана Навуменкі, Максіма Танка, Янкі Брыля. Поспехі ў навукова-даследчай працы дасягнуты дзякуючы апантанай дзейнасці таленавітых вучоных А. М. Булыкі, Т. В. Валодзінай, У. В. Гніламедава, С. У. Грунтова, Я. А. Гарадніцкага, Т. В. Габрусь, А. У. Гурко, В. І. Жука, І. Л. Капылова, В. М. Курцовай, Л. П. Кунцэвіч, Г. М. Кісліцынай, С. С. Лаўшука, А. І. Лакоткі, Б. А. Лазукі, Т. Г. Мдзівані, М. У. Мікуліча, А. М. Ненадаўца, В. М. Нікалаевай, І. В. Саверчанкі, Я. М. Сахуты, В. С. Юшкевіч і многіх іншых, хто імкнецца працягваць лепшыя традыцыі.

Найважнейшай падзеяй у гісторыі суверэннай Беларусі стала даследчая праца, накіраваная на навуковае абгрунта-

ванне гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Вучоныя Інстытута гісторыі НАН Беларусі разам з калегамі з ВНУ краіны грунтоўна займаліся навуковай распрацоўкай гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Засноўваючыся на выніках шматгадовых даследаванняў гісторыкаў, якія на працягу многіх стагоддзяў вывучалі розныя перыяды і падзеі, уводзячы ў навуковы ўжытак шматлікія раней невядомыя дакументы і матэрыялы, дзе адлюстроўваліся многія старонкі жыцця беларускага народа, была выдадзена пяцітомная «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» [12] (мал. 8).



Мал. 8. «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»
Fig. 8. «The history of Belarusian statehood»

У працэсе навуковых пошукаў і падрыхтоўкі гэтага выдання аўтарскі калектыў грунтоўна даследаваў праблему фарміравання беларускага этнасу, вывучаў яго месца і ролю ў дзяржаўных утварэннях, у складзе якіх знаходзіліся беларускія землі да рэальнага афармлення ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці. Адпаведна кожны том прысвечаны аналізу гісторыі беларускай дзяржаўнасці на тым ці іншым этапе яе развіцця.

Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці грунтуецца на разуменні гістарычнага паходжання беларускага этнасу, непарушнасці права беларускага народа на рэалізацыю ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці. Несумненна, нашы продкі ўдзельнічалі ва ўтварэнні Полацкай зямлі, Тураўскага княства і іншых зямель і княстваў, якія ўваходзілі ў склад Кіеўскай Русі, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі і Савецкага Саюза. У кожным томе «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці» зафіксаваны ключавыя падзеі, якія зрабілі найбольшы ўплыў на фарміраванне і развіццё беларускай дзяржаўнасці на працягу многіх стагоддзяў.

Знакавай навуковай і грамадскай падзеяй з'явілася выданне ўнікальнай працы «Республика Беларусь – 25 лет созидания и свершений» у 7 тамах [13]. Гэта найбуйнейшы навукова-выдавецкі праект у найноўшай гісторыі нашай краіны. Выданне падрыхтавана з мэтай выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 2017 г. № 72 «Аб падрыхтоўцы і выпуску навукова-папулярнага друкаванага выдання». У працы прадстаўлена больш за сто тэм, якія адлюстроўваюць дасягненні беларускага народа за 25 гадоў суверэннага дзяржаўнага будаўніцтва ў грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і духоўна-культурнай сферы. Над ажыццяўленнем гэтага важнага грамадска значнага праекта было задзейнічана больш за 400 аўтараў з ліку вядомых у краіне і за мяжой вучоных, дзяржаўных служачых міністэрстваў і ведамстваў, а ў якасці рэцэнзентаў і кансультантаў выступілі вышэйшыя службовыя асобы і кіраўнікі дзяржаўных органаў. Выдатныя поспехі вучоных-гісторыкаў дасягнуты дзякуючы плённай працы вядучых даследчыкаў В. Ф. Голубева, В. В. Даніловіча, А. Б. Доўнара, А. І. Дзярновіча, І. У. Жылінскай, А. А. Кавалені, А. Г. Калечыц, М. А. Красновай, В. Л. Лакізы, А. М. Літвіна, В. У. Марфінай, В. Г. Мазца, М. Б. Несцяровіча, Н. Я. Новік, В. А. Пілецкага, А. Л. Самовіча, М. У. Смяховіча, М. М. Смальянінава, П. А. Трубчыка, С. А. Траццяка, В. Р. Шумілава і іншых.

пакалення, у фарміраванні яго духоўна-культурных каштоўнасцей, грамадзянскіх і патрыятычных якасцей. Гуманітарная навука з'яўляецца падмуркам і найважнейшай асновай усяго адукацыйнага працэсу, яна дазваляе сфарміраваць не вузкаспецыялізаванага прафесіянала, а чалавека з шырокім гуманістычным поглядам на прыроду і грамадства. Менавіта такі падыход можа выратаваць нас ад цывілізацыйнага варварства, дзе б яно ні праяўлялася – у палітыцы, эканоміцы, міжнародных адносінах, экалогіі, сродках масавай культуры, што нам даводзіцца назіраць і перажываць зараз.

Зразумела, што мы жывём у XXI ст. – век навукова-тэхнічнага прагрэсу, развіцця камп'ютарных тэхналогій, сотавай сувязі, лічбавага тэлебачання, асваення космасу, выкарыстання новых відаў энергіі і геномных адкрыццяў, якія здольны дапамагчы вырашыць праблемы з голадам і палепшыць якасць жыцця. Але не менш важнай задачай, якая паўстае ў грамадскім жыцці ў пачатку XXI ст., з'яўляецца захаванне нацыянальна-гістарычнай свядомасці народа, каб не дапусціць духоўнага прыгнёту і разбурэння культурнага асяроддзя, абуджаць і захоўваць жыццёвыя сілы ў народзе. Менавіта забеспячэнню гэтай гістарычнай місіі павінны служыць гуманітарныя навукі.

Сёння патрэбны намаганні вучоных-гуманітарыяў усіх краін свету, каб арганізаваць сумесныя даследаванні і выпрацаваць навукова-абгрунтаваныя падыходы развіцця сусветнага грамадства ў XXI ст. Важна разумець, што глабалізацыя сусветнай прасторы ўласціва пераходу ў новае тысячагоддзе. Патрэбна настойлівая навукова-даследчая праца, каб вынікі дзейнасці гуманітарыяў сталі для палітычных лідараў асновай пры прыняцці практычных рашэнняў, каб сусветная палітыка і эканоміка вядучых краін свету працавалі на карысць устойлівага развіцця сусветнага грамадства.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Гарлун, С. Скарына пра Біблію і пра сябе / С. Гарлун // Беларус. думка. – 2017. – № 12. – С. 72–79.

2. Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / гал. рэд. Г. П. Пашкоў. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2001. – 496 с.

3. Акадэмічная гуманітарыстыка: важнейшыя вынікі 2022 года / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў. – Мінск : Беларус. навука, 2023. – 239 с.

4. Гістарычны слоўнік беларускай мовы : у 37 вып. / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т мовазнаўства. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982–2017. – 37 вып.

5. Беларусы : у 13 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2012. – 13 т.

6. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. – Мінск : Беларус. навука, 1999–2003. – 4 т.

7. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя : у 10 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Выд-ва «Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі». – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2004–2021. – 10 т.

8. Вялікі гістарычны атлас Беларусі [Карты] : у 4 т. / Дзярж. кам. па маёмасці Рэсп. Беларусь, Белкартаграфія. – Мінск : Белкартаграфія, 2009–2018. – 4 т.

9. Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы : [больш за 117000 слоў] / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літаратуры, Ін-т мовазнаўства, Аб'яд. ін-т праблем інфарматыкі ; [уклад.: В. П. Русак і інш. ; рэдкал.: В. П. Русак, Ю. С. Гецэвіч, С. І. Лысы]. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 757 с.

10. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 000 слоў : у 2 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства ; [уклад.: І. Л. Капылоў і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларусь, 2022. – 2 т.

11. Русско-белорусский системный семантический словарь : в 2 т. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит., Ин-т языкознания. – Минск : Беларус. навука, 2023. – 2 т.

12. История белорусской государственности : в 5 т. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; [редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2018–2020. – 5 т.

13. Республика Беларусь – 25 лет созидания и свершений : в 7 т. / ред. совет: В. П. Андрейченко [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2020. – 7 т.

14. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2008–2017. – Т. 1–4.

References

1. Garlun S. Skaryna about the Bible and about himself. *Belaruskaya dumka* [Belarusian Thought], 2017, no. 12, p. 72–79 (in Belarusian).

2. Pashkou G. P. (ed,). *Enlighteners of the land of Belarus, 10th – early 20th centuries: encyclopedic guide.* Minsk, Belaruskaya ehntsyklapedyya Publ., 2001. 496 p. (in Belarusian).

3. National Academy of Sciences of Belarus. *Academic humanitarian science: the most important results of 2022.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2023. 239 p. (in Belarusian).

4. *The Historical dictionary of the Belarusian language.* Minsk, 1982–2017. 37 vol. (in Belarusian).

5. Institute of Art Studies, Ethnography and Folklore National Academy of Sciences of Belarus. *The Belarusians.* Minsk, 1995–2009. 13 vol. (in Belarusian).

6. *The History of the Belarusian literature of the XX century.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 1999–2003. 4 vol. (in Belarusian).

7. *Towns and villages of Belarus.* Minsk, Belaruskaya ehntsyklapedyya Publ., 2004–2021. 10 vol. (in Belarusian).

8. *The great historical atlas of Belarus.* Minsk, Belkartagrafiya Publ., 2009–2018. 4 vol. (in Belarusian).

9. *Orthoepic dictionary of the Belarusian literary language.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 757 p. (in Belarusian).

10. *Explanatory dictionary of the Belarusian literary language.* Minsk, Belarus' Publ., 2022. 2 vol. (in Belarusian).

11. *Russian-Belarusian sistem semantic dictionary.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2023. 2 vol. (in Russian).

12. Kovalenya A. A. (ed.). *The history of the Belarusian statehood.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018–2020. 5 vol. (in Russian).

13. *The Republic of Belarus – 25 years of creation and accomplishments.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2020. 7 vol. (in Russian).

14. Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus. *The history of philosophical and socio-political thought of Belarus.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2008–2017, vol. 1–4. (in Belarusian).

Информация об авторе

Коваленя Александр Александрович – академик, доктор исторических наук, профессор, академик-секретарь. Отделение гуманитарных наук и искусств, Национальная академия наук Беларуси (пр. Независимости, 66, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: humanity@presidium.bas-net.by.

Information about the author

Aliaksandr A. Kavalenia – Academician, D. Sc. (Hist.), Professor, Academic Secretary of the Department of Humanitarian Sciences and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus (66 Nezavisimosti Ave., Minsk 220072, Belarus). E-mail: humanity@presidium.bas-net.by.

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

ФІЛАСОФІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ

PHILOSOPHY AND SOCIOLOGY

УДК 316.422.6:130.3
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2024-69-1-18-24

Поступила в редакцию 14.03.2022
Received 14.03.2022

А. А. Головач

Белорусский государственный экономический университет, Минск, Беларусь

«РАСЧЕЛОВЕЧИВАНИЕ ЧЕЛОВЕКА» – КЛЮЧЕВАЯ ПРОБЛЕМА СОВРЕМЕННОЙ ЭПОХИ

Аннотация. Проблема человека, исконно относящаяся к числу фундаментальных проблем философии и культуры, сегодня не утрачивает свою значимость, но обретает особую остроту и, соответственно, актуальность.

